Весн. Беларус. дзярж. пед. ун-та імя М. Танка. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. – 2004. – № 2. – С. 10–12.
12. *Марцынкевіч, І. А.* Працаўладкаванне ў Беларускай ССР інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (1944–1956 гг.) / І. А. Марцынкевіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2012. – Вып. 27. – С. 196–201.

**І. А. Саракавік**

## ВЕЙМАРСКАЯ РЭСПУБЛІКА І СССР: АГУЛЬНАЕ І АДМЕТНАЕ

Веймарскай рэспубліцы і СССР паасобку прысвечаны шматлікія даследаванні замежных і беларускіх даследчыкаў, аднак у вызначанай пастаноўцы тэмы аўтару не давялося сустракаць прац. Тым не менш такая пастаноўка дазваляе адначасова паглядзець на станаўленне і развіццё гэтых дзяржаў і ажыццявіць пэўныя высновы. Найперш паўстае пытанне пра тое, як былі ўтвораны гэтыя краіны, а таксама чаму іх не стала на карце свету. Зразумела, што ў невялікім артыкуле разгарнуць гэтае пытанне не магчыма. Каб лепш уявіць станаўленне, трэба прыгадаць, якім складаным на той час было геапалітычнае становішча.

Першая чвэрць XX ст. прадстаўлена ў гісторыі як вялізная сацыяльная катастрофа, якой свет да гэтага не бачыў. Галоўным чынам саперніцтва дзяржаў за рынкі збыту ў перыяд імклівага развіцця іх індустрыялізацыі і палітычныя матывы прывялі да Першай сусветнай вайны. У ёй прымалі ўдзел 38 краін, было мабілізавана каля 74 млн чалавек, у тым ліку 60 млн у Еўропе. Агульныя страты склалі прыкладна 10 млн жыццяў, ахвярамі з ліку цывільнага насельніцтва сталі каля 12 млн, дзясяткі мільёнаў былі паранены [1].

Першая сусветная вайна прывяла да буйнейшых сацыяльных рэвалюцый: Лютаўскай і Кастрычніцкай 1917 г. у Расіі, Лістападаўскай 1918 г. у Германіі. Усё гэта спрычынілася да знікнення з карты свету чатырох імперый: Асманскай, Аўстра-Венгерскай, Германскай і Расійскай і стварэння новых дзяржаў. Адбылося пераразмеркаванне сфер уплыву буйнейшых дзяржаў свету. На авансцэну фаварытам замест Вялікабрытаніі, Францыі і ў пэўнай ступені Германіі выйшлі Злучаныя Штаты Амерыкі.

Асабліва вялікія страты панесла Германія, якая лічылася галоўнай віноўніцай вайны. Апошняя каштавала ёй 2 млн забітымі, 4,2 млн параненымі, і 73 млрд долараў. У цэлым яна страціла 1/8 частку тэрыторыі, 1/12 частку насельніцтва, усе калоніі. Версальскім дагаворам прадугледжвалася выплата рэпарацый на суму 20 млрд залатых марак, а ў 1921 г. іх сума была павялічана да 132 млрд залатых марак. На тэрыторыях, якія ў яе былі забраныя, працавала каля 900 тыс. рабочых, якія выраблялі чыстай прадукцыі на 2,1 млрд марак, а гэта складала 10 % прамысловай прадукцыі Германіі [2, с. 69–70].

Расія падчас вайны таксама панесла значныя страты, хоць і меншыя, чым Германія. Згодна з дадзенымі Галоўнага ўпраўлення Генеральнага штаба дзяржавы на 3 кастрычніка 1917 г. 775 369 салдат і афіцэраў загінулі і прапалі без звестак. 3 223 508 былі параненыя, палонных – больш за 2 млн чалавек. Заходнія крыніцы адзначаюць 1,7 млн забітымі і памерлымі ад ран, 4,95 млн параненымі і 2,5 млн ваеннапалонных [3].

Значыць, першая выснова заключаецца ў тым, што і Германія, і Расія панеслі значныя страты ў Першай сусветнай вайне і ў яе выніку абедзве імперыі распаліся. Аднолькавы незайдросны лёс.

Вайна прынесла вялізныя чалавечыя, матэрыяльна-фінансавыя страты, у значнай меры пагоршыла становішча насельніцтва, адбыліся вышэй згаданыя рэвалюцыі. У выніку гэтых зменаў у Германіі *да ўлады прыйшлі сацыял-дэмакраты*, якія правялі выбары ў Нацыянальны сход. 31 ліпеня 1919 г. ён зацвердзіў *Канстытуцыю Германіі, якая ўступіла ў сілу 14 жніўня 1919 г.* (страціла яе толькі 5 чэрвеня 1945 г.) і атрымала гістарычную назву Веймарскай, паколькі яе прыняцце адбылося ў г. Веймар [4]. Афіцыйная назва дзяржавы з 1919 па 1933 г. была «Deutsches Reich», што азначае «Германская дзяржава».

Канстытуцыя ўключала 2 главы: уладкаванне і задачы рэспублікі, і асноўныя правы і абавязкі немцаў. У артыкуле 1 сцвярджалася, што *Германія з'яўляецца рэспублікай і дзяржаўная ўлада зыходзіць ад народа.* Згодна з раздзелам другім Канстытуцыі, *вышэйшая заканадаўчая ўлада належала рэйхстагу* (ніжняй палаце парламента). Дэпутаты ў яго выбіраліся мужчынамі і жанчынамі, дасягнуўшымі 20-гадовага ўзросту ўсеагульнай, роўнай, прамой і таемнай падачай галасоў згодна з прапарцыянальным прадстаўніцтвам на 4 гады (арт. 22).

Як бачна з арт. 41–58, *вышэйшая выканаўчая ўлада належала прэзідэнту дзяржавы і падкантрольнаму яму ўраду на чале з канцлерам.* Ім мог стаць кожны немец ва ўзросце 35 гадоў, выбраны германскім народам на 7-гадовы тэрмін.

Арт. 60–67 чацвёртага раздзела прысвечаны верхняй палаце парламента – **рэйхсрату** (дзяржаўнаму савету), які складаўся з прадстаўнікоў зямель (рэспублік). Значыць, *формай дзяржаўнага ўладкавання засталася федэрацыя.* Краіна складалася з 15 рэспублік (зямель) і 3 «вольных гарадоў», якія карысталіся значнай аўтаноміяй. Да зямель належылі: Ангальт, Баварыя, Бадэн, Браўншвайг, Вальдэк, Вюртэмберг, Гесэн, Ліпе, Мекленбург-Стрэліц, Мекленбург-Шверын, Ольдэнбург, Прусія, Саксонія, Цюрынгія, Шаўмбург-Ліпе. Вольныя гарады: Брэмен, Гамбург, Любек. Самай буйной зямлёй засталася Прусія. Склад насельніцтва і тэрыторыі быў разнастайны. Названыя *землі не былі сфарміраваныя згодна з этнічнай ці эканамічнай прыкмеце, а скlaліся гістарычна.* Некаторыя з іх нават не мелі акрэсленай тэрыторыі, а невялікімі часткамі ўваходзілі ў іншыя землі.

У адпаведнасці з арт. 61 кожная зямля мела мінімум 1 голас, буйныя – 1 голас на 700 тыс. жыхароў. Характэрна, што ***ні адзін суб'ект не мог быць прадстаўлены больш, чым 2/5 галасоў.*** Гэта норма была прынята дзеля

абмежавання долі Прусіі, якая мела больш за 60 % плошчы і насельніцтва краіны. У выніку з 66 галасоў Прусія мела 26, Баварыя – 11, Саксонія – 7, Вюртэмберг – 4, Бадэн – 3, Цюрынгія, Гасен, Гамбург – па 2, астатнія 9 зямель – па адным голасе. У той жа час згодна з арт. 62 *у камісіях рэйхсрата ні адна зямля не мела права мець больш аднаго голаса*. Землі ў рэйхсраце былі прадстаўлены членамі сваіх урадаў (арт. 63).

*Кожная зямля мела свае канстытуцыі і свае заканадаўчыя органы –* **ландтагі**, прававы статус якіх вызначаўся артыкуламі 36–39. Аднак правы суб'ектаў Рэспублікі былі істотна абмежаваныя ў заканадаўчай і ў фінансавай сферах. Землі маглі выкарыстаць сваё заканадаўчае права ў дачыненні да малазначных мясцовых пытанняў: мясцовыя падаткі, добраўпарадкаванне, санітарная служба, мясцовая школа і г.д. Найбольш кампетэнцый яны мелі ў адміністрацыйнай сферы.

У той жа час *Веймарская канстытуцыя не прадугледжвала права выхаду сваіх суб'ектаў з Рэспублікі*. Наадварот, за ёй захоўвалася права адміністрацыйнага нагляду («экзекуцыі») за мясцовымі органамі (арт. 48).

Адзначаючы адметнасці Веймарскай канстытуцыі, неабходна звярнуць увагу на тое, што ў *Рэспубліцы не існавала стабільнасці*, якая была да Першай сусветнай вайны. Даследчыкі звязваюць гэта як з тым, што грамадства не было гатова ўспрыняць атрыманую жаданую свабоду, яна ім не здалася лепшай за страчаную стабільнасць, так і з эканамічнай катастрофай першай паловы 20-х гг. Адзначаецца адносна слабая ўлада цэнтра, што з'явілася як станоўчым, так і адмоўным фактарам: у пасляваенны перыяд, які характарызуецца сацыяльна-эканамічным напружаннем, моцная цэнтральная ўлада была бы больш эфектыўнай. У той жа час станоўчы фактар заключаўся ў больш самастойным развіцці суб'ектаў Рэспублікі.

На развіццё Веймарскай рэспублікі адмоўна паўплывала тое, што паміж не толькі партыямі розных палітычных кірункаў, але нават аднаго, напрыклад, левага (сацыял-дэмакратаў і камуністаў), не знайшлося паразумення, кансэнсусу, наконт будучыні дзяржавы.

Прыкладна на гэты час прыходзіцца і ўтварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік – 1922 г. *Ініцыятарам яго з'яўлялася адна партыя – РКП(б), а не шэраг, як у Германіі*. І гэта адметна.

*Працэс утварэння СССР пачаўся не з усеагульных выбараў, як у Германіі, а з выбараў прыхільнікаў бальшавіцкай партыі па савецкіх рэспубліках*. Гэта былі рэгіянальныя з'езды РКП(б). Нават на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў з 230 дэлегатаў 213 з'яўлялся членамі РКП(б), астатнія – «спачуваючыя» ім [5, с. 143]. 18 снежня 1922 г. IV Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб утварэнні СССР. Па такой жа схеме былі прыняты станоўчыя пастановы «з'ездаў Саветаў» РСФСР, УССР, ЗСФСР. *Па сутнасці гэта былі рашэнні партыйныя, а не агульнанародныя. У гэтым другая адметнасць*. З аднаго боку, гэта не стварала праблем для практычна адзінадушнага рашэння, а, з другога боку, не прыявіла, памкненняў розных сацыяльных пластоў насельніцтва, палітычных партый і арганізацый. Такі

падыход бальшавіцкага цэнтра зразумелы, бо на ўскраінах былой імперыі ў грамадстве былі прыхільнікі БНР, УНР і інш., якія марылі аб незалежнасці сваіх рэгіёнаў; невядома, якім мог быць іх адказ на гэтае пытанне.

I з'езд Саветаў СССР адбыўся 30 снежня 1922 г. з 2 215 дэлегатаў прыходзілася на РСФСР 1 727, УССР – 364, ЗСФСР – 91, ССРБ – 33 дэлегаты. *Бальшавікі складалі 94,1 % ад усіх дэлегатаў з'езда.* Згодна з дакладам **І. В. Сталіна** з'езд прыняў Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР. 31 студзеня 1924 г. II з'езд Саветаў СССР зацвердзіў Канстытуцыю Савецкага Саюза [6, с. 116, 122]. Значыць, *роўнасці прадстаўніцтва рэспублік не існавала*, прадстаўнікоў УССР, ЗСФСР і ССРБ разам узятых было ў 3,5 разы менш, чым дэлегатаў РСФСР. Таму прадстаўніцтва гэтых рэспублік з'яўлялася фіктыўным, ад іх не залежала прынящце рашэнняў, хоць яны мелі права выказаць сваю думку. Роўнасці не існавала і згодна з Веймарскай канстытуцыяй. Аднак, як адзначалася раней, ні адна з зямель не магла мець больш, чым 2/5 усіх галасоў (арт. 61). Гэта найперш датычылася Прусіі. **У гэтым прынцыповае адрозненне.** Такі падыход дазваляў прадстаўнікам іншых зямель сумесна правесці свой праект рашэння. Савецкія рэспублікі нават тэарэтычна не маглі так зрабіць.

Згодна з арт. 3 Асноўнага Закона СССР 1924 г. саюзныя рэспублікі ажыццяўлялі сваю суверэнную ўладу толькі па-за межамі саюзнай кампетэнцыі. А паколькі апошняя была істотнай, то для рэспублік заставаліся малазначныя мясцовыя пытанні [7]. І *тут пэўнае падабенства з Веймарскай канстытуцыяй.* У той жа час *арт. 4 гарантаваў права саюзнай рэспубліці свабоднага выхаду з Саюза, чаго не існавала ў Веймарскай канстытуцыі, што з'яўлялася адметным.*

*Вярхоўны орган улады СССР – з'езд Саветаў.* Ён склікаўся адзін раз на год, а ў перыяд паміж з'ездамі – *Цэнтральны Выканаўчы Камітэт*, які складаўся з Саюзнага Савета і Савета Нацыянальнасцей (арт. 8). Дэпутатамі Саюзнага з'езда з'яўляліся прадстаўнікі гарадскіх Саветаў і Саветаў гарадскіх пасяленняў з разліку 1 дэпутат на 25 000 выбар-шчыкаў і прадстаўнікоў саюзных рэспублік, у якіх не было губерняў, і губернскіх з'ездаў Саветаў з разліку 1 дэпутат на 125 000 жыхароў (арт. 9, 10). Значыць, *Канстытуцыя СССР улічвала класавы падыход* і ў выбарах, па-першае, *аддавала перавагу рабочым, а не сялянам у суадносінах 1 да 5*, другімі словамі, існаваў пэўны недавер да сялянства. Па-другое, *выбары былі шматступеньчатымі*: спачатку выбіраліся дэпутаты губернскіх, саюзных рэспублік, а потым яны са сваіх шэргаў выбіралі дэпутатаў на Саюзны з'езд. Гэта давала магчымасць цэнтру выбраць тых, хто больш адпавядаў. Такіх выбараў у Веймарскай рэспубліцы не існавала.

На аснове Канстытуцыі з'езд выбраў ЦВК у складзе 371 члена прапарцыянальна насельніцтву кожнай з саюзных рэспублік, другімі словамі, ён паўтараў склад з'езда Саветаў. Гэта азначала, што *склад прадстаўнікоў РСФСР у ЦВК больш, чым у тры з паловай разы пераўзыходзіў склад іншых саюзных рэспублік разам узятых*. ЦВК СССР 2-га склікання быў выбраны

ў складзе 414 членаў, з іх 303 – ад РСФСР, і 220 кандыдатаў у члены Саюзнага Савета і 100 членаў Савета Нацыянальнасцей, у тым ліку 70 – ад РСФСР, 5 – ад УССР, 5 – ад БССР і 20 – ад ЗСФСР. Значыць, і ***ў ЦВК, і ў Савеце Нацыянальнасцяў членаў ад РСФСР было больш, чым 2/3 і рашэнні гэтых устаноў поўнасцю залежалі ад іх***. Такі падыход ЦК РКП(б) не быў выпадковым, ён адпавядаў генеральнай лініі партыі ў адносінах да нацыянальнага пытання.

Прапанова аб двухпалатным ЦВК была выказана **І. В. Сталіным**. На думку А. І. Чысцякова, ідэя «правадыра народаў» заключалася ў тым, што першая палата павінна клапаціцца пра агульнанародныя інтарэсы, а другая – улічваць інтарэсы шматнацыянальнага насельніцтва Саюза [8]. Аднак такая прапанова Сталіна не была падтрымана некаторымі савецкімі рэспублікамі, найперш Украінскай і Грузінскай. Сваімі поглядамі, якія супярэчылі пазіцыі І. В. Сталіна, найбольш выдзяляўся старшыня СНК УССР Хрысціян Георгіевіч Ракоўскі (1873–1941). Балгарскі камуніст займаў адказную дыпламатычную пасаду ў РСФСР. Працуючы кіраўніком урада Украіны, ён, як ніхто іншы, востра адчуваў дыктат наркаматаў РСФСР на камісарыяты рэспублікі. Такое становішча лічыў незадавальняючым і падымаў пытанне аб ***прызнанні Масквой нацыянальных і дзяржаўных правоў савецкіх рэспублік як суб'ектаў міжнародных праваадносін***. Калі 26 студзеня 1922 г. рашэннем Палітбюро ЦК РКП(б) была ўтворана камісія ЦК для ліквідацыі наркаматаў замежных спраў савецкіх рэспублік, апрача РСФСР, яна сустрэла рэзкую крытыку з боку Ракоўскага. Ён прапанаваў прыкметна зменшыць правы і паўнамоцтвы агульнасаюзных наркаматаў і значную частку з іх перадаць саюзным рэспублікам [9, с. 142, 174].

Х. Г. Ракоўскі выступіў і супраць пазіцыі Сталіна аб утварэнні Савета Нацыянальнасцей як другой палаты ЦВК. Замест гэтага *ён прапанаваў арганізаваць Савет рэспублік з роўным прадстаўніцтвам у ім усіх савецкіх рэспублік*, у тым ліку і РСФСР. Ракоўскі ўнёс і прапанову аб тым, што ў другой палаце ні адна з рэспублік не павінна мець больш за 2/5 галасоў. Гэта дазваляе меркаваць, але не сцвярджаць, што ён быў добра знаёмы з нормамі і палажэннямі Веймарскай канстытуцыі, у якой прысутнічала такая норма. Тут жа ён патлумачыў, чаму патрэбны менавіта Савет рэспублік: «Мы не участвуем в качестве национальностей в различных государственных объединениях, а участвуем в качестве государства». Папраўка Х. Г. Ракоўскага была пастаўлена на галасаванне, але прыхільнікамі Сталіна не была прынята [10, с. 165–166, 169–171].

Такім чынам, прадстаўлены матэрыял дазваляе зрабіць вывад, што практычна ў адзін і той жа гістарычны перыяд былі ўтвораны прадстаўнікамі левых партый рэспублікі – Веймарская сацыял-дэмакратамі і СССР бальшавікамі. Аднак агульнага ў іх менш, чым адметнага. Такое становішча было абумоўлена шэрагам прычын: ступенню развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы, палітычнай і прававой культуры, мэтаў дзяржаўнага будаўніцтва. Тым не менш, не стала спачатку Веймарскай рэспублікі з прыходам да ўлады Гітлера, а затым і Савецкага Саюза. Аднак гэта ўжо іншая тэма.

ЛІТАРАТУРА

1. Первая мировая война [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа : 22.02.2017.
2. *Шульц, Э. Э.* От Веймарской республики к Третьему рейху: электоральная история Германии 1920 – начала 1930-х гг. / Э. Э. Шульц. – М. : ЛЕНАНАД, 2016. – 272 с.
3. Потери Первой мировой войны [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа : 22.02.2017.
4. Конституция Германской империи (Веймарская) 11 августа 1919 г. [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : http://pnu.edu.ru/ru/faculties/full_time/uf/iogip/study/studentsbooks/histsources2/igpzio64/. – Дата доступа : 23.02.2017.
5. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1976. – Т. 3 : Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.). – 1973. – 696 с.
6. История СССР с древнейших времен до наших дней: в двух сериях : в 12 т. – М. : Наука. – Сер. 2. – Т. VIII : Борьба советского народа за построение фундамента социализма в СССР. 1921–1932 гг. – 1967. – 726 с.
7. Конституция СССР 1924 [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : http://www.hist.msu.ru/ER/Etext/cnst1924.htm. – Дата доступа : 23.02.2017.
8. Состав ЦИК СССР 2-го созыва [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : http://www.bestreferat.ru/referat-37277.htm; http://constitution.garant.ru/science-work/modern/4096920/chapter/4/. – Дата доступа : 23.02.2017.
9. *Чернявский, Г. И.* Жизненный путь Христиана Раковского. Европеизм и большевизм: неоконченная дуэль / Г. И.Чернявский, М. Г. Станичев, М. В. Тортика (Лобанова). – М. : Центполиграф, 2014. – 557 с.
10. Известия ЦК КПСС. – 1991. – № 5. – С. 165–171.

**М. М. Смольянинов**

## К ВОПРОСУ ОБ УЧАСТИИ ЖЕНСКОГО БАТАЛЬОНА СМЕРТИ В СРАЖЕНИЯХ НА БЕЛОРУССКОЙ ЗЕМЛЕ (июль 1917 г.)

Завершался с неуспехом для Российской империи с огромными территориальными, материальными и людскими потерями третий год Первой мировой войны. В соответствии с военной конвенцией стран Антанты и под нажимом союзниц России по этому военному блоку (Англии и Франции) шла подготовка очередного наступления войск русской армии против австро-германских. На территории белорусских губерний в то время занимали позиции на линии Видзы, Поставы, Сморгонь, Барановичи, Пинск войска российского Западного фронта. Корпусами 10-й армии этого фронта планировалось осуществление прорыва фронта германских войск на 20-километровом участке в районе Крево.